25 сакавіка адбыўся адкрыты конкурс мультымедыйных праектаў "Мая малая Радзіма", арганізаваны Акадэміяй Федэральнай службы выканання пакаранняў Расіі (г. Разань). Конкурс прайшоў ў межах X Міжнароднага тыдня творчасці курсантаў "Віват, курсант!", да якога далучыўся Магілёўскі інстытут МУС.

Мэтай конкурсу арганізатары назвалі фарміраванне і развіццё патрыятычнага светапогляду, заснаванага на гістарычнай памяці і павазе да подзвігаў нашых продкаў, а таксама на пачуцці нецярпімасці да фальсіфікацыі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

На суд журы курсанты з навуковага гуртка кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін прадставілі мультымедыйныя праекты ў конкурснай намінацыі "Мая малая Радзіма – зямля Героя". Намінацыю прымеркавалі да 80-годдзя пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Курсанты распавялі пра двойчы Героя Савецкага Саюза Івана Якубоўскага і пра супрацоўнікаў міліцыі, якія загінулі, абараняючы Магілёў летам 1941 г., – капітана Канстанціна Уладзіміра ва і байца яго батальёна Сямёна Дрышчанку. Дарэчы, супрацоўнікі Магілёўскага інстытута МУС прымалі ўдзел у пошукавай экспедыцыі, вынікі якой дазволілі вярнуць імя Сямёна Дрышчанкі на старонкі гісторыі Вялікай Айчыннай.

Міжнароднае журы высока ацаніла прэзентацыі нашых канкурсантаў. Першакурснік **Данііл Смірноў**, які падрыхтаваў працу пад кіраўніцтвам дацэнта Антона Ігнатовіча, атрымаў дыплом першай ступені. А праца курсанта 2 курса **Дзмітрыя Якаўчыка** (навуковы кіраўнік – начальнік кафедры Сяргей Венідзіктаў) заняла трэцяе месца.

Па інфармацыі кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін

Phoca PDF